# 11 клас

2 тур

Шаноўныя ўдзельнікі алімпіяды!

У другім туры вы павінны даць адказы на тэставыя заданні розных формаў. Перад кожным заданнем прыводзіцца колькасць балаў, якія можна атрымаць за правільны адказ. Максімальная колькасць балаў – 137. Уважліва чытайце заданні.

Жадаем поспехаў!

| **I. Выберыце адзін правільны варыянт адказу**<br>За кожны правільны адказ – 1 бал, усяго за заданне 30 балаў | |
|---|---|
| **Гісторыя Беларусі** | **Сусветная гісторыя** |
| **1.** Якое з усходнеславянскіх плямёнаў не прымала ўдзелу ў фарміраванні беларускай народнасці:<br>а. крывічы-палачане;<br>б. радзімічы;<br>в. паляне;<br>г. дрыгавічы.<br>**2.** Крыж Еўфрасінні Полацкай быў падараваны ёю наступнай царкве:<br>а. Сафійскай;<br>б. Барысаглебскай;<br>в. Варварынскай;<br>г. Спаскай.<br>**3.** У 1399 г. войска вялікага князя Вітаўта пацярпела паражэнне ад войск Цімура Кутлука ў бітве на рацэ:<br>а. Сінія воды;<br>б. Угры;<br>в. Ворскле;<br>г. Крапіўне.<br>**4.** Войска ВКЛ, якое ў жніўні 1506 г. разбіла татарскае войска пад Клецкам, узначальваў:<br>а. К. Астрожскі;<br>б. М. Глінскі;<br>в. Вітаўт;<br>г. Мікалай Радзівіл Чорны.<br>**5.** Які мастацкі стыль з’явіўся ў архітэктуры Беларусі ў канцы XVI ст.?<br>а. класіцызм;<br>б. барока;<br>в. готыка; | **16.** Варварскае каралеўства вестготаў было створана ў V ст. ў:<br>а. Паўночнай Афрыцы;<br>б. Іспаніі;<br>в. Паўночнай Італіі;<br>г. Галіі.<br>**17.** Па выніках Стогадовай вайны ў валоданні Англіі захаваўся толькі адзін горад на французскай зямлі:<br>а. Брэтань;<br>б. Ліль;<br>в. Кале;<br>г. Дувр.<br>**18.** У якой краіне і з якой мэтай упершыню быў арганізаваны такі від кавалерыі, як гусары?<br>а. у Маскоўскай дзяржаве для барацьбы з татарамі;<br>б. у Польшчы для барацьбы з Маскоўскай дзяржавай;<br>в. у ВКЛ для барацьбы з татарамі;<br>г. у Венгрыі для барацьбы з туркамі.<br>**19.** Горад Ліму, новую сталіцу Перу, заснаваў іспанскі канкістадор:<br>а. Эрнан Картэс;<br>б. Франсіска Пісара;<br>в. Фернан Магелан;<br>г. Васка да Гама.<br>**20.** У пачатку XIX ст. сярод мастацкіх стыляў у рускім дойлідстве панаваў:<br>а. барока; |

г. рэнесанс.

**6.** Згодна з Андрусаўскім перамір’ем паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай Рэч Паспалітая захавала ў сваім складзе землі:
а. смаленскія;
б. Падзвінне;
в. северскія;
г. чарнігаўскія.

**7.** Спецыяльнай гістарычнай дысцыплінай, якая займаецца вывучэннем пячатак, з’яўляецца:
а. геральдыка;
б. палеографія;
в. сфрагістыка;
г. эпіграфіка.

**8.** Аўтарам твора “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” з’яўляецца:
а. А. Міцкевіч;
б. П. Багрым;
в. У. Сыракомля;
г. Я. Баршчэўскі.

**9.** У 1870–1880-я гг. у беларускіх губернях праводзілася наступная з рэформ:
а. земская;
б. судовая;
в. інвентарная;
г. сталыпінская аграрная рэформа.

**10.** Першы прыватны банк у беларускіх губернях быў адчынены у 1873 г. ў наступным беларускім горадзе:
а. Гомелі;
б. Мінску;
в. Гродне;
г. Віцебску.

**11.** Беларусь была абвешчана Народнай Рэспублікай Выканкамам Рады Усебеларускага з’езда у прынятай апошнім:
а. “Дэкларацыі правоў народаў Расіі”;
б. Першай Устаўной грамаце;
в. Трэцяй Устаўной грамаце;
г. Другой Устаўной грамаце.

**12.** Згодна з Канстытуцыяй БССР 1937 г. вышэйшым занадаўчым органам дзяржаў-

б. ракако;
в. класіцызм;
г. эклектыка.

**21.** Самай паспяховай і паслядоўнай сярод рэформ 1860–1870-х гг. у Расіі была:
а. школьная рэформа;
б. судовая рэформа;
в. земская рэформа;
г. вайсковая рэформа.

**22.** “Срэбраным векам” рускай куль туры называюць перыяд:
а. другую палову XIX ст.;
б. першую палову XIX ст.;
в. пачатак XX ст.;
г. другую палову XX ст.

**23.** Балгарыя аб’явіла сябе царствам і абвясціла незалежнасць ад Турцыі ў:
а. у 1910 г.;
б. у 1876 г.;
в. у 1908 г.;
г. у 1912 г.

**24.** Указ аб рэстаўрацыі (аднаўленні) імператарскай Улады ў Японіі, ліквідаванні сёгунату і заснаванні новага ўрада быў абвешчаны:
а. 3 студзеня 1868 г.;
б. 1 студзеня 1912 г.;
в. 19 лютага 1861 г.;
г. 18 студзеня 1871 г.

**25.** Першым сярод англічан у 1907 г. быў уганараваны Нобелеўскай прэміяй у галіне літаратуры:
а. Чарлз Дыкенс;
б. Джозэф Рэд’ярд Кіплінг;
в. Льюіс Кэрол;
г. Оскар Уайлд.

**26.** Якая краіна выйшла з Арганізацыі Варшаўскага дагавора ў верасні 1968 года?
а. Венгрыя;
б. Албанія;
в. Чэхаславакія;
г. ГДР.

**27.** Як называлася знешнепалітычная

най улады ў краіне быў:
- а. Савет Народных Камісараў БССР;
- б. Вярхоўны Савет БССР;
- в. Народны сход Заходняй Беларусі;
- г. Савет міністраў БССР.

**13.** Стралковы полк, салдаты якога знішчылі ў баях пад Магілёвам у ліпені 1941 г. за адзін дзень 39 танкаў праціўніка, узначальваў:
- а. П. Рабцаў;
- б. М. Раманаў;
- в. І. Русіянаў;
- г. С. Куцепаў.

**14.** Назавіце знакамітага беларускага мастака, які стварыў габелен “Чарнобыль”, які знаходзіцца ў залі ААН у Нью-Йорке:
- а. Г. Вашчанка;
- б. Л. Шчамялёў;
- в. А. Кішчанка;
- г. М. Савіцкі.

**15.** Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была прынята:
- а. 15 сакавіка 1994 г.;
- б. 27 ліпеня 1990 г.;
- в. 3 ліпеня 1991 г.;
- г. 25 жніўня 1991 г.

дактрына СССР, згодна з якой СССР мог умешвацца ва ўнутраныя справы дзяржаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, што ўваходзілі ў сацыялістычны блок, каб забяспечваць стабільнасць палітычнага курсу, накіраванага на цеснае супрацоўніцтва з СССР?
- а. “дактрына Хрушчова”;
- б. “дактрына Брэжнева”;
- в. “дактрына Касыгіна”;
- г. “дактрына Андропава”.

**28.** Пятая рэспубліка ў Францыі была абвешчана ў:
- а. 1945 г.;
- б. 1958 г.;
- в. 1967 г.;
- г. 1972 г.

**29.** Згодна з эканамічнай рэформай 1957 г. у СССР прадугледжваўся наступны прынцып кіравання прамысловасцю:
- а. тэрытарыяльны;
- б. галіновы;
- в. мясцовы;
- г. абласны.

**30.** У авіякатастрофе пад Смаленскам 10.04.2010 загінуў польскі прэзідэнт:
- а. А. Дуда;
- б. А. Квасьнеўскі;
- в. Л. Качыньскі;
- г. Б. Камароўскі.

## II. Правільна суаднясіце элементы дзвух мностваў

За кожны поўны правільны адказ – 2 балы, усяго за заданне – 20 балаў

**31)** *выяву горада аўтарства Напалеона Орды і назву горада*

| | | | |
|---|---|---|---|
|  | |  | |
| **А.** | | **Б.** | |
|  | |  | |
| **В.** | | **Г.** | |
| **1.** Лагойск – | **2.** Гродна – | **3.** Магілёў – | **4.** Камянец – |

**32)** *партрэтныя выявы і імёны расійскіх імператрыц*

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **А.** | **Б.** | **В.** | **Г.** |
| **1.** Кацярына II – | **2.** Кацярына I – | **3.** Елізавета Пятроўна – | **4.** Ганна Іаанаўна – |

**33)** *пісьменніка і яго твор*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Эрых Марыя Рэмарк | **А.** | Па кім звоніць звон |
| **2.** | Томас Ман | **Б.** | Пахаджэнні бравага ваякі Швейка |
| **3.** | Эрнэст Хэмінгуэй | **В.** | На Заходнім фронце без зменаў |
| **4.** | Яраслаў Гашэк | **Г.** | Чароўная гара |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1** – | **2** – | **3** – | **4** – |

**34)** *помнікі дойлідства і дзяржаўныя ўтварэнні*

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **А.** | **Б.** | **В.** | **Г.** |
| **1.**Расія – | **2.** Турцыя – | **3.** Беларусь – | **4.** Індыя – |

**35)** *выявы гербаў гарадоў Беларусі і іх назвы*

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **А.** | **Б.** | **В.** | **Г.** |
| **1.**Гарадок – | **2.** Пружаны – | **3.**Расоны – | **4.** Мёры – |

**36)** *гістарычны тэрмін і яго вызначэнне*

| | |
|---|---|
| **1.** У Расіі ў XIX ст. выхадцы з розных саслоўяў, якія займаліся пераважна разумовай працай | **А.** Славянафілы |
| **2.** Плынь у рускай грамадскай думцы, якая адстойвала самабытны шлях развіцця Расіі, адрозны ад шляху заходніх краін. | **Б.** Заходнікі |
| **3.** Прадстаўнікі разначыннай інтэлігенцыі ў Расіі ў другой палове XIX ст.,якія выступалі супраць прыгону і самадзяржаўя. Верылі ў магчымасць развіцця Расіі па некапіталістычным шляху і ў сялянства як носьбіта сацыялістычных адносін. | **В.** Разначынцы |
| **4.** Плынь у рускай грамадскай думцы, якая адстойвае шлях развіцця заходняй цывілізацыі | **Г.** Народнікі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**37)** *выяву генерала часоў Грамадзянскай вайны ў Расіі і яго прозвішча*

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **А.** | **Б.** | **В.** | **Г.** |
| **1.** Красноў П. – | **2.** Юдзеніч М. – | **3.** Дзянікін А. – | **4.** Врангель П. – |

**38)** *герб і шляхецкі род Вялікага Княства Літоўскага, якому герб належаў*

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **А.** | **Б.** | **В.** | **Г.** |
| **1.** Радзівілы – | **2.** Храптовічы – | **3.** Пацы – | **4.** Тышкевічы – |

**39)** *беларускіх кнігадрукароў па парадку іх дзейнасці*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** Пётр Мсціславец | | **В.** Францыск Скарына | |
| **Б.** Кузьма Мамоніч | | **Г.** Спірыдон Собаль | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**40)** *міжнародныя арганізацыі постсавецкай прасторы па часе іх стварэння*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** ГУАМ | | **В.** ЕАЭС | |
| **Б.** ЕўрАзЭС | | **Г.**СНД | |
| **1.**– | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

| III. | Расстаўце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці |
|---|---|

За кожны поўны правільны адказ – 2 балы, усяго за заданне – 20 балаў

**41)** *падзеі грэка-персідскіх войн*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** Марафонская бітва | | **Б.** Фермапільская бітва | |
| **В.** паход Мардонія | | **Г.** бітва пры Платэях | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**42)** *каралёў Рэчы Паспалітай па часе кіравання*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** Міхал Вішнявецкі | | **Б.** Станіслаў Ляшчынскі | |
| **В.** Ян III Сабескі | | **Г.** Ян Казімір Ваза | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**43)** *гарады Беларусі згодна з годам атрымання імі Магдэбургскага права*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** Берасце | | **Б.** Магілёў | |
| **В.** Дзісна | | **Г.** Пінск | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**44)** *падзеі гісторыі гусіцкага руху*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** перамога гусітаў пад Вышаградам | | **Б.** Спаленне Яна Гуса | |
| **В.** бітва пад Ліпанамі | | **Г.** Паўстанне ў Празе | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**45)** *шведскія дынастыі па часу праўлення ад самай ранняй да найбольш позняй*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** дынастыя Бернадотаў | | **В.** Гесэнская дынастыя | |
| **Б.** дынастыя Вазаў | | **Г.** дынастыя Фолькунгаў | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**46)** *падзеі гісторыі культуры БССР*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** адкрыццё Беларускай Акадэміі навук | | **В.** адкрыццё кінастудыі мастацкіх фільмаў “Савецкая Беларусь” | |
| **Б.** адкрыццё Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі | | **Г.** пастаноўка першай беларускай савецкай оперы | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**47)** *ваенна-палітычныя блокі краін XIX ст. ад самага ранняга да найбольш позняга*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.** Саюз трох імператараў | | **В.** Чацвярны саюз | |
| **Б.** Траісты саюз | | **Г.** Свяшчэнны саюз | |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

**48)** *падзеі Першай рускай рэвалюцыі ў 1905–1907 гг.*

<table>
<tr><td colspan="2">А. выбары ў Першую дзяржаўную думу</td><td colspan="2">В. Снежаньскае паўстанне</td></tr>
<tr><td colspan="2">Б. заснаванне Дзяржаўнай Думы як законарадчага органа пры манарху</td><td colspan="2">Г. паўстанне каманды браняносца “Пацёмкін”</td></tr>
<tr><td>1. –</td><td>2. –</td><td>3. –</td><td>4. –</td></tr>
</table>

**49)** *падзеі гісторыі Беларусі пачатку 1990-х гг.*

<table>
<tr><td colspan="2">А. вывад з тэрыторыі Беларучі тактычнай ядзернай зброі</td><td colspan="2">В. прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь</td></tr>
<tr><td colspan="2">Б. стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў</td><td colspan="2">Г. прыняццё Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР</td></tr>
<tr><td>1. –</td><td>2. –</td><td>3. –</td><td>4. –</td></tr>
</table>

**50)** *генеральных сакратароў ЦК КПСС па часе іх знаходжання на пасадзе*

| А. | Б. | В. | Г. |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **1.** – | **2.** – | **3.** – | **4.** – |

| **IV.** | **Выберыце правільны варыянт адказу (пастаўце птушачку ў адпаведным слупку)**<br>За кожны правільны адказ – 1 бал, усяго за заданне – 10 балаў | | |
|---|---|---|---|
| | **Ці праўда, што**: | **так** | **не** |
| **51.** | у 1458 г. адбылося стварэнне самастойнай праваслаўнай мітраполіі ў ВКЛ | | |
| **52.** | на землях Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVI ст. існаваў манаскі ордэн базыльянцаў | | |
| **53.** | першай кнігай на тэрыторыі сучаснай Беларусі, выдадзенай кірылічным шрыфтам, быў “Апостал” Ф. Скарыны | | |
| **54.** | арміяй канфедэратаў у Грамадзянскай вайне ў ЗША камандаваў генерал Роберт Эдвард Лі | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **55.** | першай расійскай марксісцкай арганізацыяй была група “Вызваленне працы”, створаная Г. В. Пляханавым у 1883 г. у Жэневе. | | |
| **56.** | І Усебеларускі з’езд быў разагнаны 17 снежня 1917 г. нямецкімі ўладамі | | |
| **57.** | першым рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў У. Пічэта | | |
| **58.** | парад войск Чырвонай арміі на Чырвонай плошчы ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года прымаў маршал Канстанцін Ракасоўскі | | |
| **59.** | запуск першага штучнага спадарожніка Зямлі адбыўся ў СССР 4 кастрычніка 1957 г. | | |
| **60.** | у 2010 г. уступіў у сілу дагавор, падпісаны ў горадзе Кіёта (Японія), згодна яму для кожнай дзяржавы вызначаюцца гранічна дапушчальныя нормы выкіду вуглякіслага газу ў атмасферу. | | |

| **V.** | **Напішыце у правым стаўбцы гістарычныя паняцці, адпаведныя кожнаму азначэнню** | |
|---|---|---|
| Азначэнні аднаслоўныя, за кожны правільны адказ – 1 бал, усяго за заданне – 10 балаў | | |
| **61.** | Паслядоўнікі пратэстанцкай плыні ў Англіі ў XVI–XVII стст., якія прытрымліваліся вельмі строгай веры і простай (чыстай) царкоўнай службы. | |
| **62.** | Палітыка дзяржавы, накіраваная на абарону нацыянальнай эканомікі ад замежнай канкурэнцыі шляхам увядзення высокіх пошлін на тавары, якія ўвозяцца ў краіну. | |
| **63.** | Неабмежаваная ўлада, якая забяспечвае поўнае панаванне той ці іншай асобы, групы, класа. | |
| **64.** | Шырокі ідэйны рух у розных краінах Еўропы, звязаны з барацьбой супраць феадальных адносін, за ўсталяванне “царства Розуму”, заснаванага на “натуральным праве” людзей і палітыч най свабодзе. | |
| **65.** | Афіцыйная палітыка расавай сегрэгацыі і дыскрымінацыі, якая праводзілася правячай у ПАР з 1948 па 1994 г. Нацыянальнай партыяй. | |
| **66.** | Форма дзяржаўнага кіравання, пры якой улада засяроджана ў руках духавенства ці кіраўніка царквы. | |
| **67.** | Рух у грамадскім жыцці ЗША з канца 1940-х да канца 1950-х гг., які суправаджаўся | |

| | | |
|---|---|---|
| | абвастрэннем антыкамуністычных настрояў і палітычнымі рэпрэсіямі супраць іншадумцаў. | |
| **68.** | Члены створаных у 1966 г. атрадаў студэнцкай і школьнай моладзі ў Кітаі, адны з найбольш актыўных удзельнікаў “культурнай рэвалюцыі”. | |
| **69.** | Працэс ліквідацыі наступстваў культу асобы і сталінскай палітычнай сістэмы, які праводзіўся ў СССР у другой палове 1950-х – пачатку 1960-х гг. | |
| **70.** | Комплекснае, сістэмнае, нарастаўчае адзінства сучаснага свету, абумоўленае неабходнасцю вырашэння эканамічных і іншых сусветных праблем (экалагічная, дэмаграфічная праблемы, пераадоленне эканамічнай і культурнай адсталасці, асваенне калязямной прасторы, вырашэнне энергетычнага, сыравіннага, харчовага і іншых крызісаў), уключаючы захаванне сацыяльных, эканамічных і індывідуальных правоў і свабод асобы. | |

| **VI.** | **Адзначце “птушачкай” у адпаведным месцы, якая падзея адбылася раней**<br>За кожны правільны адказ – 2 балы, усяго за заданне – 20 балаў | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **71.** | | Бітва ў Тэўтабургскім лесе | **ці** | | Асада Іерусаліма арміяй Ціта |
| **72.** | | Вострaўскае пагадненнне | **ці** | | Салінскае пагадненне |
| **73.** | | Завяршэнне Рэканкісты ў Іспаніі | **ці** | | Захоп туркамі-асманамі Канстантынопаля |
| **74.** | | “Хаджэнне ў народ” | **ці** | | I з’езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП). |
| **75.** | | Першае камп’енскае перамір’е | **ці** | | Брэсцкі мір |
| **76.** | | Курская бітва | **ці** | | Бітва за Івадзіму |
| **77.** | | Карыбскі крызіс | **ці** | | “Пражская вясна” |
| **78.** | | Ісламская рэвалюцыя ў Іране | **ці** | | Ваенны пераварот у Чылі |
| **79.** | | Абвяшчэнне суверэнітэту РСФСР | **ці** | | Аб’яднанне Германіі |
| **80.** | | Падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольніцтва Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі | **ці** | | Падпісанне дагавора паміж Беларуссю і Расіяй аб стварэнні Саюзнай дзяржавы |

| **VII.** | **Вызначце, да якіх краін адносяцца ўказанныя ніжэй гістарычныя з’явы, сацыяльныя групы, палітычныя суполкі і рухі** | |
|---|---|---|
| | За кожны правільны адказ – 1 бал, усяго за заданне – 9 балаў | |
| **81.** | Санацыя | |
| **82.** | Апартэід | |
| **83.** | Разначынцы | |
| **84.** | Трэд-юніёны | |
| **85.** | Юнкеры (землеўладальнікі) | |
| **86.** | Хунвейбіны | |
| **87.** | “Новыя асманы” | |
| **88.** | Сёгунат | |
| **89.** | Якабінцы | |

**VIII.** **Адкажыце на пытанні да карт-схем**

За кожны правільны адказ – 1 бал, усяго за заданне – 6 балаў




**90.**
Тэрыторыя староства, у якім у маі 1740 г. пачалося паўстанне пад кіраўніцтва В. Вашчылы, пазначана лічбай:




**91.**
Горад, у якім у 1550–1570-х гг. дзейнічала першая у межах сучаснай тэрыторыі Беларусі тыпаграфія, пазначаны лічбай:




**92.**
Дзяржава Маньчжоу-Го, падначаленая Японіі, была створана на тэрыторыі, якая пазначана лічбай:




**93.**
Горад, дзе ў 1941 г. быў створаны агульнагарадскі падпольны гарком КП(б)Б, які ўзначаліў І.К. Кавалёў, пазначаны лічбай:




**94.**
Любавічскі кірмаш у першай палове XIX стагоддзя быў найбольш буйным кірмашом у губерні, пазначанай лічбай:




**95.**
Бярэзінскі канал, будаўніцтва якога было скончана ў пачатку XIX стагоддзя, пазначаны лічбай:

| X. | Напішыце, падзеі якіх войн намаляваны на ніжэйпрыведзеных рэпрадукцыях карцін |
|---|---|

Кожны поўны адказ – 2 балы (1 бал – вайна, 1 бал – годы), усяго за заданне – 12 балаў



**96.**



**97.**

| | |
|---|---|
|  |  |
| **98.** | **99.** |
|  |  |
| **100.** | **101.** |